Весці БДПУ. Серыя 2. 2025. № 2. С. 90–95

*УДК 1:316(476)(043.3)*

# КУЛЬТУРАЦЭНТРЫСЦКАЯ ПАРАДЫГМА САЦЫЯГУМАНІТАРНАГА ПАЗНАННЯ ЯК ІНТЭГРАЛЬНАЯ МЕТАДАЛОГІЯ НАВУКОВАГА ПАЗНАННЯ

**В. А. Максімовіч,**
*доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела філасофіі літаратуры і эстэтыкі Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9062-6984*

Паступіў у рэдакцыю 11.03.2025.

*UDC 1:316(476)(043.3)*

# THE CULTURE-CENTRIC PARADIGM OF SOCIO-HUMANITARIAN COGNITION AS AN INTEGRAL METHODOLOGY OF SCIENTIFIC COGNITION

**V. Maximovich,**
*Doctor of Philology, Professor, Head of the Department of Philosophy of Literature and Aesthetics Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9062-6984*

Received on 11.03.2025.

Раскрываецца роля каштоўнасна-светапогляднага патэнцыялу ў фарміраванні культурацэнтрысцкай парадыгмы сацыяльна-гуманітарнага пазнання. Адзначаецца, што ў сітуацыі пашырэння інфармацыйнай прасторы суб'ект пазнавальнай дзейнасці вымушаны карэктаваць свае кагнітыўныя ўстаноўкі, метады і падыходы, ад чаго шмат у чым залежыць вынікoвасць і ступень верыфікацыі эпістэмалагічных даследаванняў. Даказваецца, што ад стану і ступені выяўленасці крэатыўнасці каштоўнасна-светапогляднага патэнцыялу суб'екта ў гуманітарным пазнанні ў значнай ступені абумоўлена і паспяховасць уласна філасофскага асэнсавання новай культурацэнтрысцкай парадыгмы гуманітарных ведаў. У гэтым выяўляе сябе тэндэнцыя да ўзмацнення ўплыву чалавечай суб'ектнасці і суб'ектыўнасці, гнуткай рацыянальнасці, шматмернасці інфармацыйных і каштоўнасна-сэнсавых установак і камунікатыўнага выбару, што дае падставу інтэрпрэтаваць навуковае даследаванне не толькі як мэтарацыянальную, але і каштоўнаснарацыянальную пазнавальную дзейнасць. Робіцца высновa аб неабходнасці стварэння механізму аптымізацыі падыходаў да сацыягуманітарнага пазнання ва ўмовах фарміравання адзінай інфармацыйнай прасторы, што звязана не толькі з вырашэннем тэарэтыка-гнасеалагічных праблем, але і гатоўнасцю сацыяльна-гуманітарных ведаў адказаць на ўзнікаючыя выклікі сучаснасці.

*Ключавыя словы:* светапогляд, каштоўнасці, каштоўнасная свядомасць, культурацэнтрысцкая парадыгма, сацыяльна-гуманітарнае пазнанне, інфармацыйная прастора, цыфравізацыі, суб'ект пазнання.

The role of the value-ideological potential in the formation of a culturocentric paradigm of social and humanitarian cognition is revealed. It is noted that in a situation of expanding the information space, the cognitive subject is forced to adjust his cognitive attitudes, methods and approaches, which largely determines the effectiveness and degree of verification of epistemic research. It is proved that the success of the philosophical understanding of the new cultural-centrist paradigm of humanitarian knowledge is largely determined by the state and degree of expression of creativity of the value and ideological potential of the subject in humanitarian cognition. This reveals a tendency to increase the influence of human subjectivity and subjectivity, flexible rationality, multidimensional informational and value-semantic preferences and communicative choice, which gives grounds to interpret scientific research not only as purposeful, but also value-rational cognitive activity. It is concluded that it is necessary to create a mechanism for optimizing approaches to socio-humanitarian knowledge in the context of the formation of a unified information space, which is associated not only with solving theoretical and epistemological problems, but also with the readiness of socio-humanitarian knowledge to respond to the emerging challenges of our time.

*Keywords:* worldview, values, value consciousness, cultural-centered paradigm, socio-humanitarian cognition, information space, digitalization, cognitive subject.

Навуковыя інавацыі, якія закранаюць самыя разнастайныя спектры і галіны гуманітарных даследаванняў, маюць непасрэднае дачыненне да распрацоўкі новых напрамкаў філасофскага пошуку, вырашэння наспелых эпістэмалагічных задач, звязаных з аналізам моўных і культурных феноменаў, складнікаў і механізмаў сацыякультурнай дынамікі, якія аказваюць свой уплыў на ўзровень і вынік пазнання, у тым ліку і на разуменне спецыфікі падыходаў да прадмета навуковага даследавання. Шмат у чым гэтаму спрыяюць сацыякультурныя трансфармацыі, якія прыводзяць да парадыгмальных зрухаў у гуманітарным пазнанні, перагляду ўяўленняў аб прыродзе чалавека (суб'екта, суб'ектыўнасці), яго ўзаемаадносін з навакольнай рэальнасцю, што знаходзіць сваё адлюстраванне як на ўзроўні ўдасканалення паняційна-тэрміналагічнага апа-

рату, так і на ўзроўні быццёва-сутнасным. У кантэксце праблем даследавання перадумоў і падстаў гуманітарнага пазнання апраўданым і досыць матываваным выступае сцвярджэнне, што выпрацоўка новай эпістэмалагічнай парадыгмы непарыўна звязана з аналізам сацыякультурных, моўных, культуралагічных, мастацка-эстэтычных, гістарычных аспектаў пазнання, іх узаемнай абумоўленасці, з ініцыяцыяй нестандартных падыходаў, контуры якіх ужо выяўляюцца ў інтэлектуальнай прасторы сучасных гуманітарных ведаў.

Даследаванне спецыфікі гуманітарнага пазнання атрымлівае новы імпульс з развіццём новых метадаў даследавання феноменаў чалавечага быцця, якія ўзнікаюць у межах прыродазнаўчых, дакладных навук і міждысцыплінарных галін ведаў (сінергетыка, кагнітывістыка і г. д.). Пры гэтым у сучаснай філасофскай літаратуры, па перакананні даследчыкаў, актуальным застаецца пошук асноў узаемадзеяння розных філасофска-метадалагічных стратэгій, у тым ліку стратэгій кагерэнтнасці культуры і пазнання ў сацыяльна-гуманітарным дыскурсе (герменеўтычнай, семіятычнай, постструктуралісцкай і інш.), што прыводзіць да пэўных рознагалоссяў у вызначэнні прадмета і базавага метаду сацыяльных і гуманітарных даследаванняў.

Гуманітарнае (і шырэй – сацыягуманітарнае) пазнанне, як вядома, валодае сваімі спецыфічнымі асаблівасцямі, характэрным метадалагічным інструментарыем, які шмат у чым абумоўлены культурай навукова-гуманітарнага мыслення. Па словах даследчыкаў, «аб'ектам гуманітарнага даследавання з'яўляецца тая сфера культурнай, гістарычнай, псіхалагічнай, моўнай, сацыяльнай рэальнасці, той яе "зрэз", які ўяўляе сабой зыходны падмурак пазнавальнай дзейнасці.Прадметам гуманітарнага пазнання з'яўляецца тая частка культурна-гістарычнай рэальнасці, якая прадугледжвае канстытуяванасць, рэканструкцыю, дапаўненне у працэсе пазнання, уключаючы ўяўленні аб культурных рэаліях, што склаліся ў межах навуковай традыцыі. Паняцце прадмета мае на ўвазе наяўнасць уласнай логікі развіцця ў кантэксце ўзаемадзеяння навуковай традыцыі і навацый» [1]. На думку спецыялістаў, сацыягуманітарнае пазнанне павінна ўспрымацца не як пазнанне вонкавага аб'екта, а як сродак паглыблення суб'ектнага самаразумення, саматоеснасці з аксіялагічным модусам культуры, набываючы тым самым характар трансцэндэнтальнасці. Аб'ектам гуманітарнага тыпу пазнання становяцца «ўнутраны свет чалавека, тэксты, літаратурныя жанры, эстэтычныя ідэі, сацыякультурныя феномены, культура, якія выступаюць у якасці сэнсавай рэальнасці. Пад уплывам гісторыка-культурнага кантэксту, каштоўнасных установак, асабістых прыярытэтаў, перакананняў суб'екта адзін і той жа аб'ект можа выступаць прадметам вывучэння розных гуманітарных дысцыплін» [2].

Да асноўных тыпаў гуманітарнага навуковага мыслення можна аднесці гістарызм, цэласнасць, дыялагізм, кантэкстуальнасць, залежнасць спосабу прадстаўлення і тлумачэння вывучаемай з'явы ад уласнай духоўна-эстэтычнай культуры і жыццёва-каштоўнаснай пазіцыі даследчыка / пазнаючага суб'екта. Сацыягуманітарнае пазнанне звязана з каштоўнасна-светапогляднымі ўстаноўкамі і перакананнямі пазнаючага суб'екта, вымушанага прыстасоўвацца да істотнага змянення інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы. Выкарыстанне вынікаў даследаванняў у гуманітарнай сферы напрамую звязана з успрыманнем кагнітыўных установак, што прыводзіць да новага павароту ў разуменні праблемы адказнасці вучонага, які прапануе для шырокай публікі пэўным чынам структураваную сістэму сваіх навуковых поглядаў і перакананняў. Ад стану і ступені выяўленасці крэатыўнасці каштоўнасна-светапогляднага патэнцыялу суб'екта ў гуманітарным пазнанні шмат у чым залежыць выніковасць і ступень верыфікацыі эпістэмалагічных даследаванняў, закліканых больш поўна адлюстраваць працэс пазнання, а таксама паспяховасць уласна філасофскага асэнсавання новай культурацэнтрысцкай парадыгмы гуманітарных ведаў.

Па сутнасці, сацыяльна-гуманітарнае пазнанне мае суб'ектную прыроду і характарызуецца нелінейнасцю і адкрытасцю сістэм узаемадзеяння, аўтанамізацыяй стратэгій пазнання і дзейнасці, свайго роду інтэрыярызавана-інтраспектыўнай скіраванасцю ў тым сэнсе, што прадмет даследавання ў дадзеным выпадку адначасова з'яўляецца і найважнейшым складальнікам суб'екта пазнання, ментальныя ўстаноўкі якога паступова зрушваюцца ў бок ірацыянальных, інтуітыўных, спантанных, сінергетычных механізмаў узнаўлення, трансляцыі ведаў. Дадзеная асаблівасць выступае прычынай таго, што вектар і кірунак пошуку задаецца ад усеагульнага да адзінкавага, ад агульнага да асаблівага. І ў гэтым выяўляе сябе тэндэнцыя да ўзмацнення ўплыву чалавечай суб'ектнасці і суб'ектыўнасці, што непасрэдна суправаджаецца гнуткай рацыянальнасцю, шматмернасцю інфармацыйных пераваг і камунікатыўнага выбару і вядзе да спасціжэння цэласнасці рэальнасці быцця. Прысутнасць чалавечай суб'ектыўнасці (пазнаючага суб'екта) у сацыяльна-гуманітарным пазнанні цесна звязана з праблемай разумення, якая, у сваю чаргу, актыўна ўплывае на працэс пазнання і дасягненне кансенсусу па найбольш важных тэарэтыка-метадалагічных пытаннях і светапоглядных пазіцыях.

Ключавое месца ў сацыягуманітарным пазнанні адводзіцца праблеме каштоўнасцей. Нароўні з прызнаннем ісціны ў якасці галоўнай каштоўнасці сацыягуманітарнага пазнання варта

ўлічваць і ўплыў сацыякультурных фактараў на характар і прыроду каштоўнасцей. Дадзены тып пазнання не можа абмяжоўвацца толькі лінейнымі, узаемазалежнымі сувязямі, заканамернасцямі, працэсамі, якія развіваюцца паралельна ці замяшчаюцца нелінейным падыходам, мэтай якога становіцца выяўленне шматмерных, шматварыянтных сувязей, і раскрыццём асаблівага, індывідуальнага. Мадэляванне каштоўнасных рэгулятываў уяўляе сабой важны элемент сучаснага філасофска-культуралагічнага дыскурсу. Каштоўнасна-сэнсавыя асновы чалавечага быцця знаходзяць сваё ўвасабленне ў рэлятывісцкіх канцэпцыях постмадэрнізму, кампаратывісцкай філасофіі, герменеўтычных тэорыях, сацыялогіі ведаў, філасофіі і сацыялогіі адукацыі, тэорыях міжкультурнай камунікацыі, сінергетычным падыходзе да сацыякультурных працэсаў і інш. Навуковая пазіцыя суб’екта пазнання таксама шмат у чым абумоўлена светапогляднай афарбаванасцю уласнай каштоўнасна-рэгулятыўнай мадэлі, дэтэрмінаванай, поруч з рацыянальным складнікам, і эмацыйнай сферай чалавека, якая ўяўляе сабой універсальна арганізаваную субстанцыю структуры свядомасці. Гэта дазваляе казаць пра інтэрсуб’ектыўную прыроду каштоўнаснай свядомасці, што суправаджае пазнанне і дзейнасць. М. С. Каган бачыць спецыфіку гэтай з’явы ў адсутнасці прамога шляху ад ведаў да дзеяння: «Матывацыйную ролю ў практычных паводзінах індывіда могуць адыгрываць толькі перажыванне, эмацыйная прыцягальнасць, пачуццё, а яно... і з’яўляецца псіхалагічным субстратам і падмуркам каштоўнасных адносін» [3, с. 200]. Размова, па сутнасці, ідзе аб першакрыніцах фарміравання каштоўнаснай свядомасці, якая пераўтварае каштоўнасныя ўласцівасці быцця ў свой прадмет дзякуючы разнастайным эмацыйным перажываннямі, што дае магчымасць інтэрпрэтаваць навуковае даследаванне не толькі як мэтарацыянальную, але і каштоўнаснарацыянальную пазнавальную дзейнасць, якая мае прыкметы праектна-канструктыўнага кагнітыўнага дзеяння. Прадметам каштоўнаснай свядомасці, па вызначэнні Ю. А. Мірошнікава, «выступае каштоўнасць, пераўтвораная ў элемент свядомасці, у значнай ступені вызначаемая дзейсным стаўленнем чалавека да свету, яго месцам у соцыуме, яго духоўнай сталасцю, выхаванасцю яго пачуццяў» [4, с. 68]. У сітуацыі гетэрагеннасці культурных маніфестацый і полівалентнага навуковага пошуку метадалагічна апраўданым варта прызнаць зварот да філасофска-метадалагічнага патэнцыялу розных даследчых стратэгій, іх дыялагічнага ўзаемадзеяння, што адкрывае шлях да шматмернага вытлумачэння ісціны.

Аб’ектыўны характар ісціны ў навуковым пазнанні не выключае факту яе адноснасці як непаўнаты дасягнутых ведаў, што абумоўлена складанасцю і шматузроўневасцю пазнавальнай дзейнасці, супярэчнасцю і асаблівасцю аб’ектаў даследавання, а таксама перманентным удасканаленнем працэсу пазнання. Адноснасць ісціны ў сацыяльна-гуманітарным пазнанні шмат у чым абумоўлена і абставінамі суб’ектыўна-асобаснага плана, светапогляднымі і каштоўнаснымі ўстаноўкамі суб’екта пазнавальнай дзейнасці, абранымі метадамі і прынцыпамі пазнання, мэтамі і задачамі, грамадска-палітычнымі інтарэсамі і г. д.

Паколькі полем даследавання ў навуках аб культуры з’яўляецца тэкст як знакава-сімвалічная сістэма, то асноўнымі метадамі сацыягуманітарных дысцыплін з’яўляюцца метады працы з тэкстам – перш за ўсё, метады герменеўтыкі (мастацтва тлумачэння, інтэрпрэтацыі і разумення тэксту). Калі прыродазнаўчыя навукі закліканы растлумачыць з’яву, то герменеўтыка ставіць мэтай іх вытлумачыць, зразумець. І ў дадзеным выпадку найважнейшую ролю адыгрывае каштоўнасная свядомасць як адрэфлексаваная форма каштоўнасных адносін паміж чалавекам і аб’ектам каштоўнаснай свядомасці. Таму ёсць падставы меркаваць, што каштоўнасная свядомасць набывае важную аксіялагічную функцыю ў працэсе сацыякультурнага пазнання і дзейнасці, закліканых фіксаваць каштоўнасныя ўласцівасці аб’екта – маральныя, эстэтычныя, рэлігійныя, інтэлектуальныя, гуманістычныя і інш., даваць ім каштоўнасную ацэнку і фарміраваць каштоўнасныя ўяўленні. Пры гэтым, паводле меркавання даследчыкаў, «на суб’екце ляжыць адказнасць за атрыманне дакладных ведаў, паколькі даводзіцца ўлічваць яго каштоўнасна-светапоглядныя ўстаноўкі, перакананні, зацікаўленні, якія ўдзельнічаюць у працэсе ўстанаўлення аб’ектыўнасці, дакладнасці гуманітарных ведаў. Пад дакладнасцю адлюстравання рэальнасці тэкстам разумеецца «паўната жыцця», адлюстраванне і захаванне бясконцых адценняў, асабістага вопыту, перакананняў. Адкрытасць гуманітарнага тыпу тэксту дапускае шматзначнасць яго тлумачэнняў, гэта значыць, чытач са сваімі каштоўнасна-светапогляднымі ўстаноўкамі, перакананнямі ўспрымаецца як рэальны сааўтар» [2].

Асаблівасцю гуманітарнага навуковага тыпу ведаў з’яўляецца тое, што пры стварэнні абстрактнага паняцця «з мэтай атаясамлення і абагульнення многіх рэальных аб’ектаў мы разам з тым павінны захаваць тыя ці іншыя канкрэтныя іх рысы і ўласцівасці» [5, с. 258]. У сувязі з гэтым досыць цяжка дасягнуць пэўнага кансенсусу ў выпрацоўцы стандартнай агульнапрынятай мовы для гуманітарнай тэорыі ў сілу індывідуалізаванасці, спецыфікацыі даследуемага матэрыялу, які цяжка паддаецца навуковай структурызацыі і тыпалагізацыі, патрабуе прымянення адпаведнага тэрміналагічнага апарату, здольнага адэкватна перадаць індывідуальнае і ўніверсальна-сэнсавае адзінства значэнняў.

Аб’ектыўная сітуацыя імклівай змены навукова-метадалагічных і філасофска-культу-

ралагічных падыходаў, якія склаліся гістарычна, з неабходнасцю падштурхоўвае да пошуку новых даследчых стратэгій і закладвае падмурак складанага і важнага для гуманітарнага дыскурсу напрамку даследавання. Дадзены падыход у сацыяльна-гуманітарным пазнанні, які звязаны з расшыфроўкай «кода культуры», мае на ўвазе наступныя вектары даследавання: вывучэнне культуры і яе базавых прынцыпаў з улікам вербальна-сімвалічнай афарбаванасці; выяўленне асновасутнасных параметраў культуры («культурнага кода»), фактараў культурнай дынамікі; узнаўленне базавых механізмаў трансляцыі культуры як фактару сацыялізацыі індывіда з дапамогай выяўлення дыферэнцыяльных матрыц культурных маркераў, якія праяўляюць сябе ў формаўтваральных практыках (навука, мастацтва, рэлігія, філасофія).

Гэта тычыцца і праблемы канцэптуалізацыі паняцця «культурацэнтрызм», якое ў апошні час набывае рысы сапраўды ўніверсальнай сэнсавай дэфініцыі. Культурацэнтрызм як стратэгія выяўлення і інтэрпрэтацыі культурных артэфактаў у сітуацыі культурнай разнастайнасці з высокім узроўнем складанасці культурнай сістэмы дазваляе ўсебакова рэканструяваць «культурныя тэксты», прапанаваць альтэрнатыўнае іх разуменне. Культурацэнтрызм выступае асновай «культуртворчага светапогляду» (А. Швейцер), які ляжыць у аснове працэсаў культурафарміравання і культурастварэння. Вядомы даследчык праблем культуры і культуралагічных ведаў Л. Закс звязвае культурацэнтрызм са змястоўнай характарыстыкай сучаснай культурнай свядомасці, адносіць яго да асаблівай сферы прадметнай арыентацыі светаадносін, заўважаючы ў гэтай сувязі, што «гэтая прадметная арыентацыя форм культурнай свядомасці выступае іх змястоўнай дамінантай, базавай матрыцай і своеасаблівым агульным назоўнікам («знаменателем»), што мадыфікуецца ў кожным канкрэтным выпадку, з’яўляючыся характарыстыкай парадыгмы свядомасці. Змест гэтай парадыгмы – аб’ектыўная і ўсвядомленая скіраванасць свядомасці да рэпрэзентацыі і засваення культуры як асаблівай самадастатковай рэальнасці, засяроджанасць свядомасці на асэнсаванні механізмаў функцыянавання і развіцця розных кампанентаў культуры, працэсаў і вынікаў яе работы, спосабаў яе існавання і адносін да прыроды, грамадства, чалавека, жыцця [6, с. 424–425]. Культурацэнтрызм характарызуецца і ўспрымаецца большасцю даследчыкаў у якасці стваральнай стратэгіі, якая непасрэдна ўплывае на фарміраванне асобаснай ідэнтычнасці, пераадоленне сацыяльнай раз’яднанасці і служыць дасягненню грамадскай згоды і ўзаемаразумення. Культурацэнтрызм трактуецца і як тып мыслення, у аснове якога ляжыць духоўнае вымярэнне, якое супрацьстаіць «тэхнацэнтрызму» і «тэхнакратызму». В. С. Біблер пазіцыянуе культурацэнтрызм як асаблівую сітуацыю, якая склалася ў XX ст. і звязана з вылучэннем культуры ў эпіцэнтр усіх чалавечых учынкаў, у выніку чаго быццё свету ўспрымаецца як вытворчае ад культуры [7, с. 233–243]. Па перакананні У. І. Талстых, формула культурацэнтрызму выражае і нясе ў сабе інтэнцыю на новыя каштоўнасці і жыццёвыя сэнсы, якія павінны прыйсці на змену каштоўнасцям спажывецкага грамадства і стаць духоўнай асновай новага тыпу цывілізацыйнага развіцця. Падобную думку знаходзім у А. С. Запясоцкага, які бачыць місію культурацэнтрызму ў «адаптацыі цывілізацыйнай моцы новых тэхналогій да базавай сістэмы культурных каштоўнасцей» [8, с. 18]. Нарэшце, культурацэнтрызм, па перакананні некаторых даследчыкаў, уяўляе сабой своеасаблівы правобраз «новай архітэктуры», якая спрыяе ўсталяванню інстытуцыйных прынцыпаў адносін паміж рознымі краінамі і народамі.

Мадэль культурацэнтрызму мяркуе ўзмацненне ролі суб’екта ў культурным працэсе, у працэсе творчасці, культурастварэння, самарэалізацыі з улікам таго, што дыялектыка культуры па пераважэ адлюстроўвае асобасны культурагенез і культуралагічную рэфлексію ўнутранага свету чалавека, асобасную інкультурацыю і культуратворчасць. Культура, увасобленая ў культурных артэфактах і іншых фундаментальна зафіксаваных формах, актуалізуецца, усведамляецца і спасцігаецца толькі суб’ектыўна, праходзячы скрозь унутраны свет суб’екта. Падобная мадэль не суадносіцца з паняццем культурнага ізаляцыянізму, манізму, цэнтрызму, а, наадварот, утрымлівае ў сабе ідэю культурнага інтэгральнага поліцэнтрызму, разнастайнасці, дыялогу, якія адкрываюць перспектыву стэрэаскапічнага бачання сацыяльных, антропных з’яў і працэсаў ва ўсёй шматстатнасці іх аспектаў і генерыруючых фактараў. Як уяўляецца, гэты важны момант не ўлічваецца апанентамі культурацэнтрызму, якія ставяць пад сумнеў яго апэрацыянальнасць з прычыны шматзначнасці паняцця «культура». Калі адштурхоўвацца ад ноуменальнага, сутнаснага разумення культуры як сферы каштоўнасцей і сэнсаў, якія матывуюць працэсы стварэння другой прыроды, то «ідэя культурацэнтрызму набывае выразнасць, метадалагічную пэўнасць. Аснову культурацэнтрысцкай навукова-даследчай праграмы складае працэдура эксплікацыі каштоўнасна-сэнсавых асноў чалавечай дзейнасці і сацыяльнага ўзаемадзеяння, што ператварае герменеўтыку ва ўсеагульную метадалагічную аснову сацыяльна-гуманітарных ведаў» [9, с. 207].

Фарміраванне новай культурацэнтрысцкай парадыгмы, пераход да цыфравізацыі культуры з’яўляецца адной з вядучых тэндэнцый сучаснага свету, вынікам чаго становіцца дынамічнае фарміраванне новай мадэлі сацыягуманітарнага пазнання, што характарызуецца адметнымі рысамі (фарміраванне інтэрнэт-прасторы, нейронавых сетак, узнікненне культурных інтэрфейсаў,

г. зн. камп'ютарнай рэпрэзентацыі культурных артэфактаў, з'яўленне новых суб'ектаў культурна-адукацыйнай дзейнасці і т. д.). Цыфравізацыя мае як станоўчыя, так і адмоўныя наступствы для сферы культуры, паступова набываючы прыкметы рызыкагеннасці, звязаныя перш за ўсё з «эпістэмалагічнымі зрухамі светапогляду» [10]. У сувязі з гэтым даследчыкі завастраюць увагу на тым, што «лічбавізацыя забяспечвае разбурэнне цэласных карцін свету, дыскрэдытацыю ключавых вобразаў і сэнсаў, узамен прадстаўляючы фрагментаваны постнаратыў, забяспечваючы экстэрытарыяльнае ўкараненне ў свядомасць прыўнесеных звонку вобразаў і сэнсаў; перафарматаванне каштоўнаснай матрыцы грамадства; універсалізацыю светапогляду з дапамогай падаўлення традыцыйных сістэм светапогляду» [11, с. 130].

З улікам гэтага ўзнікае неабходнасць стварэння механізму аптымізацыі падыходаў да сацыягуманітарнага пазнання ва ўмовах фарміравання адзінай інфармацыйнай прасторы, што звязана не толькі з рашэннем тэарэтыка-гнасеалагічных праблем, але і гатоўнасцю сацыяльна-гуманітарных ведаў адказаць на ўзнікаючыя выклікі сучаснасці. Новыя рэаліі, звязаныя з узнікненнем новых культурных маркераў, схіляюць таксама да пошуку шляхоў фарміравання мадэрнізаванай эпістэмы гуманітарнага развіцця, уключаючы новыя канцэпты і ўніверсаліі культуры эпохі інфармацыйнай рэвалюцыі, стварэнне новага паняційна-катэгарыяльнага рада гуманітарных сэнсаў у кантэксце прымянення сінергетычны метадалогіі да аналізу культуры як складанай сацыяльнай і культурнай сістэмы (у прыватнасці, такіх паняццяў, як адкрытасць, нелінейнасць, эмерджэнтнасць, інаватыўнасць, фрактальнасць, спантаннасць), і, як вынік, выпрацоўка новых духоўна-маральных арыенціраў і стандартаў чалавека і грамадства.

Такім чынам, можна канстатаваць, што кардынальныя змены сучаснага свету і спосабы яго апісання і тлумачэнні схіляюць да стварэння новых падыходаў у сацыягуманітарным пазнанні. Пераход да некласічнай эпістэмалогіі адбываецца на шляху пераасэнсавання тых фундаментальных катэгорый і канцэптуальных схем, якія адлюстроўвалі погляд класічнай эпістэмалогіі на асаблівасць працэсу гуманітарнага пазнання, дыферэнцыяцыю і спецыфіку яго прадметных галін, іх метадалагічныя ўстаноўкі. Разам з тым, варта заўважыць, што філасофскія даследаванні гуманітарнага пазнання не толькі не вычарпалі сваіх магчымасцей, але, наадварот, аказваюцца ўсё больш запатрабаванымі і ў філасофскім, і ў навуковым дыскурсе. Нельга не пагадзіцца з А. П. Агурцовым у тым, што «кожная філасофская канцэпцыя ў XX стагоддзі будавала сваю канцэпцыю навукі, стварала свой вобраз навукі – яе структуры, мэты, асновы, метады. Гэтыя вобразы навукі, якія ствараюцца рознымі інтэлектуаламі – ад філосафаў да навукоўцаў той ці іншай спецыяльнасці, становяцца крыніцай унутраных установак свядомасці, іх зацікаўленняў і выбару. Яны шмат у чым вызначаюць намаганні саміх навукоўцаў» [12, с. 100].

Наяўнасць культурных маркераў, светапогляднага патэнцыялу сацыяльна-гуманітарнага пазнання ва ўмовах глабалізацыі сведчыць аб тым, што гуманітарная навука набывае новыя грамадскія функцыі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства. Сацыяльна-гуманітарнае пазнанне, у сваю чаргу, заклікана садзейнічаць забеспячэнню гістарычнай пераемнасці, фарміраванню, узнаўленню і раскрыццю сацыяльнага і культурнага генафонду, дзякуючы якому транслююцца найбольш жыццяздольныя ўзоры паводзін, каштоўнасна-нарматыўныя ўяўленні, якія замацаваныя ў сацыякультурнай традыцыі і складаюць базіс, аснову міжасобасных і грамадскіх адносін.

Усплёск цікавасці да гнасеалагічных праблем (канец XX – пачатак XXI ст.) звязаны ў тым ліку і з фарміраваннем новай культурацэнтрысцкай парадыгмы гуманітарнага пазнання, пранікненнем метадалагічных прыёмаў за межы асобных абласцей пазнання, узнікненнем новых міждысцыплінарных галін ведаў, актывізацыяй працэсу інтэграцыі прыватных навук пра чалавека. У прасторы паміж «выклікам эпохі», новымі культурнымі рэаліямі і нявыявышанасцю ўнутрынавуковых праблем, інакш кажучы, паміж «вонкавым сацыякультурным кантэкстам» і іманентнасцю ходу развіцця гуманітарнай думкі, і разважаецца свабода выбару аб'ектаў і прадметаў гуманітарных навук, што цесна звязана з пошукам новых метадалагічных парадыгмаў і даследчых праграм.


### Літаратура

1. *Ищенко, Е. Н.* Современная эпистемология в контексте гуманитарного познания / Ищенко Елена Николаевна : автореф. дис. ... д-ра философ. наук [Электронный ресурс]. – URL: https://www.dissercat.com/content/sovremennaya-epistemologiya-v-kontekste-gumanitarnogo-poznaniya (дата обращения: 07.02.2021).
2. *Пахонина, Е. В.* Специфика гуманитарного типа научного познания [Электронный ресурс] / Е. В. Пахонина // – URL: file:///C:/Users/Downloads/spetsifika-gumanitarnogo-tipa-nauchnogo-poznaniya.pdf (дата обращения: 24.02.2022).

### References

1. *Ishchenko, E. N.* Sovremennaya epistemologiya v kontekste gumanitarnogo poznaniya / Ishchenko Elena Nikolavna : avtoref. dis. ... d-ra filosof. nauk [Elektronnyj resurs]. – URL: https://www.dissercat.com/content/sovremennaya-epistemologiya-v-kontekste-gumanitarnogo-poznaniya (data obrashcheniya: 07.02.2021).
2. *Pahonina, E. V.* Specifika gumanitarnogo tipa nauchnogo poznaniya [Elektronnyj resurs] / E. V. Pahonina // – URL: file:///C:/Users/Downloads/spetsifika-gumanitarnogo-tipa-nauchnogo-poznaniya.pdf (data obrashcheniya: 24.02.2022).

3. *Каган, М. С.* Философия культуры / М. С. Каган. – СПб. : Петрополис, 1996. – 415 с.
4. *Мирошников, Ю. И.* Ценностное сознание и его структура / Ю. И. Мирошников // Научный ежегодник Института философии и права. – Уральск, отд. РАН. – 2003. – № 4. – С. 66–83.
5. *Микешина, Л. А.* Особенности создания абстракций и теорий в гуманитарных науках / Л. А. Микешина // Человек. Наука. Цивилизация. К семидесятилетию акад. В. С. Степина. – М. : Канон, 2004. – 816 с.
6. *Закс, Л.* Культуроцентристская парадигма в современном искусстве / Л. Загс // Quaestio Rossica. – Т. 9. – 2021. – № 2. – С. 419–434.
7. *Библер, В. С.* На гранях логики культуры. Книга избранных очерков / В. С. Библер. – М. : Русское феноменологическое общество, 1997. – 440 с.
8. *Запесоцкий, А. С.* Идея культуроцентристской модели образования / А. С. Запесоцкий // Культурно-антропологические основы образовательной деятельности: к вопросу о разработке культуроцентристской модели высшего образования / под ред. А. С. Запесоцкого. – СПб. : Санкт Петербургский гуманитарный университет профсоюзов, 2008. – С. 11–26.
9. *Яркова, Е. Н.* Культуроцентризм как стратегия бытия и познания / Е. Н. Яркова // Koinon. – 2020. – Т. 1. – № 1–2. – С. 199–215.
10. *French, R. P.* Deconstructing The End of Leadership: Postmodernity, Epistemology, and Worldviews / R. P. French // SAGE Open. – 2016. Vol. 6. – URL: https://doi.org/10.1177/2158244016628588 (дата обращения: 02.01.2025).
11. *Володенков, С. В.* Влияние цифровой среды на современное мировоззрение: Pro et Contra / С. В. Володенков, С. Н. Федорченко, Н. М. Печенкин // Вестник Российского университета дружбы народов. Серия: Политология. – 2023. – Т. 25. – № 1. – С. 113–133.
12. *Огурцов, А. П.* Философия науки в России: Марафон с барьерами / А. П. Огурцов // Эпистемология & философия науки. – 2004. – № 1. – С. 93–120.

3. *Kagan, M. S.* Filosofiya kul'tury / M. S. Kagan. – SPb. : Petropolis, 1996. – 415 s.
4. *Miroshnikov, Yu. I.* Cennostnoe soznanie i ego struktura / Yu. I. Miroshnikov // Nauchnyj ezhegodnik Instituta filosofii i prava. – Ural'sk, otd. RAN. – 2003. – № 4. – S. 66–83.
5. *Mikeshina, L. A.* Osobennosti sozdaniya abstrakcij i teorij v gumanitarnyh naukah / L. A. Mikeshina // Chelovek. Nauka. Civilizaciya. K semidesyatiletiyu akad. V. S. Stepina. – M. : Kanon, 2004. – 816 s.
6. *Zaks, L.* Kul'turocentristskaya paradigma v sovremennom iskusstve / L. Zags // Quaestio Rossica. – T. 9. – 2021. – № 2. – S. 419–434.
7. *Bibler, V. S.* Na granyah logiki kul'tury. Kniga izbrannyh ocherkov / V. S. Bibler. – M. : Russkoe fenomenologicheskoe obshchestvo, 1997. – 440 s.
8. *Zapesockij, A. S.* Ideya kul'turocentristskoj modeli obrazovaniya / A. S. Zapesockij // Kul'turno-antropologicheskie osnovy obrazovatel'noj deyatel'nosti: k voprosu o razrabotke kul'turocentristskoj modeli vysshego obrazovaniya / pod red. A. S. Zapesockogo. – SPb. : Sankt Peterburgskij gumanitarnyj universitet profsoyuzov, 2008. – S. 11–26.
9. *Yarkova, E. N.* Kul'turocentrizm kak strategiya bytiya i poznaniya / E. N. Yarkova // Koinon. – 2020. – T. 1. – № 1–2. – S. 199–215.
10. *French, R. P.* Deconstructing The End of Leadership: Postmodernity, Epistemology, and Worldviews / R. P. French // SAGE Open. – 2016. Vol. 6. – URL: https://doi.org/10.1177/2158244016628588 (data obrashcheniya: 02.01.2025).
11. *Volodenkov, S. V.* Vliyanie cifrovoj sredy na sovremennoe mirovozzrenie: Pro et Contra / S. V. Volodenkov, S. N. Fedorchenko, N. M. Pechenkin // Vestnik Rossijskogo universiteta druzhby narodov. Seriya: Politologiya. – 2023. – T. 25. – № 1. – S. 113–133.
12. *Ogurcov, A. P.* Filosofiya nauki v Rossii: Marafon s bar'erami / A. P. Ogurcov // Epistemologiya & filosofiya nauki. – 2004. – № 1. – S. 93–120.